Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ ДОЛЯ

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул. 12, п. 6.** (Wileńska 12, m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Падпіска на **адзін месяц** з дастаўкай да хаты **2 зл.** Для заграніцы ўдвая даражэй.
Перамена адрэса 30 грошы.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукована га залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп

№ 10. Вільня, Субота, 31-га студзеня 1925 г. Год I.

Кожны беларус, які хоча вучыць сваіх дзетак у беларускай школе, павінен скласьці аб гэтым Інспэктару дэклярацыю (гэта значыць заяву).

№ 9 „Беларускае Долі" з 30-га студзеня сканфіскаваны Камісарам Ураду за стацьці: „Найвялікшая крыўда" і „Чужая школа не дае карысьці. — Голас чытача".

„Проба прыязьні".

Сучасная Польшча мае двух натуральных ворагаў на Усходзе і Захадзе: СССР і Нямеччыну. Пад той час, як СССР, а мо' ў яшчэ вялікшай меры Радавая Беларусь і Радавая Украіна—лятуцяць аб далучэньні да іх беларускіх і украінскіх зямель, якія знаходзяцца пад Польшчай,—Нямеччына толькі аб тым і думае, каб вярнуць сабе „гданскі калідор" з местам Гданскам, ды гэтак злучыць ізноў абедзьве часьціны Нямецкае дзяржавы, парэзанае гэным „калідорам".

Польскі ўрад і польскае грамадзянства ў поўнай меры здаюць сабе аб гэтым справу. І вось, каб забясьпечыць сябе ад магчымых аружных выступленьняў з боку ўсходняга і заходняга суседзяў, Польшча ўвайшла ў самы цесны саюз з Францыяй, якая таксама, як і Польшча, баіцца „рэваншу" з боку Нямеччыны.

Баязьнь Нямеччыны — вось тая асноўная прычына, якая прымусіла Францыю сваё старое „русафільства" замяніць на „полёнофільства". Хай адпадзе сяньня гэтая прычына,—і ўся сучасная палітыка Францыі ў Эўропе можа рэзка зьмяніцца.

У апошніх нумарох на гэта зварачае ўвагу польскага грамадзянства лейб-орган польскае эндэцыі „Gaz. Warsz.". І эндэцкая газэта, хоць і ня верыць у магчымасьць здрады з боку Францыі, мае падставу трывожыцца: нямецкая палітыка, дужа добра ацэніваючы сучаснае палітычнае палажэньне ў Эўропе, пастанавіла зрабіць крок, якім маніцца зразу забіць двух зайцоў: *пагадзіцца з Францыяй*, зрокшыся думкі аб адваяваньні ад яе назад утрачаных правінцыяў—Эльзасу і Лётарынгіі,—а адначасна з тым *пакінуць сабе свабоду паступаньня на Усходзе*, спэцыяльна ў адносінах да Польшчы. Нямеччына ня болей і ня меней, як маніцца ў самым хуткім часе запрапанаваць Францыі зрабіць умову аб *узаемнай гарантыі* дагаварываючыміся дзяржавамі іх *дзяржаўных граніц*. Умова гэтая, паводле нямецкага праекту, *не датычыла-б Польшчы*...

Хаця француская прэса даволі недаверчыва адносіцца да гэтае прапазіцыі, аднак, гэта ня значыць, што падобная думка ня мае грунту ў Францыі. З другога боку, яе ў некаторай меры магла-бы падтрымаць Англія: „Times" напярад засьцерагаецца нават, што праектаваная умова аб узаемных гарантыях павінна-б абняць ня толькі дзьве дзяржавы: Нямеччыну і Францыю, але і трэцюю: Англію.

Побач з гэтым „фліртам" паміж Нямеччынай і Францыяй, яўна пагражаючым інтарэсам Польшчы ў прыпадку ўдачы нямецкага пляну,—трэба адзначыць некаторае *зьбліжэньне паміж Францыяй і СССР*, другім небясьпечным для Польшчы суседам. Пасьля юрыдычнага прызнаньня Францыяй радавага ўраду і пасылкі ў Маскву францускага пасла Эрбэта, ня гледзячы на вострыя спрэчкі ў справе прызнаньня СССР царскіх даўгоў Францыі,—французы пачынаюць наладжываць сталыя *эканамічныя зносіны з СССР*. Так, француская марское міністэрства закупіла ў СССР 75 тысяч тонн мазуту (апал для францускага флёту), і не дарма аб гэтай куплі старшыня „Нефтесиндиката" зрабіў гэткую характэрную заяву супрацоўніку „Роста": „Гэтая першая зьдзелка беспасрэдна з францускім урадам *мае для нас вялікшае значэньне, чым прадажа падвойнае колькасьці Стандарт Ойль або Шэлю.* Мы перакананы, што дастава ў Францыю радавага мазуту прыме *сталы, больш шырокі характар*".—Адначасна „Роста" публікуе вестку, што ў Маскву прыехаў з Парыжа прадстаўнік Міжнароднага Т-ва Спальных Вагонаў, які вядзе з радавым урадам перагаворы аб наладжаньні праз тэрыторыю СССР беспасрэдняга цягніка-экспрэса Парыж-Уладывасток. Міжнароднае Т-ва, фінансаванае францускім капіталам, гатова ўлажыць у гэтае прадпрыемства вялікія грошы, не падыймаючы пытаньня аб сваіх старых стратах ад нацыяналізацыі...

Не дарма „Gaz. Warsz." заклікае міністра Скшыньскага „глядеть в оба"! Перад Францыяй стаіць паважная *проба яе прыязьні да Польшчы.* Дык ці не пара і Польшчы пачаць агледацца навакол шырэй, а не глядзець выключна ў адным кірунку: на Францыю?!...

Культурная праца радашкоўскага цэнтру.

Радашкоўская беларуская гімназія разьвіваецца і мацнеець. Цяпер у гімназіі 174 вучні, лічучы разам з прыгатаваўчай клясай.

15-га студзеня быў агульны сход Т-ва Беларус. Школы, на каторы сабралося шмат вясковай і мястовай інтэлігенцыі і бацькоў.

Справаздачу аб беларускай асьвеце наагул здаваў сэнатар Уласаў. Ён падлічыў, што ў вышэйшых школах Польшчы вучыцца 200 беларусаў, у Празе чэскай 150 студэнтаў, у Савецкай Беларусі 4.000 студэнтаў беларусаў. Найлепшую эўрапэйскую культуру дастаюць студэнты ў Празе. Матурысты Радашкоўскай гімназіі паступілі ў унівэрсытэт у Італіі.

У 4-ох беларускіх гімназіях у Вільні, Радашкавічах, Навагрудку і Клецку вучацца 600 хлапцоў і дзяўчат.

Ува ўсіх польскіх гімназіях Заходняе Беларусі каля 70 проц. беларусаў; напрыклад, у Маладэчанскай польскай гімназіі, каторая месьціцца ў доме бышай вучыцельскай сэмінарыі, 70 проц. беларусаў. У Вільні ў езуіцкай гімназіі ёсьць 30 проц. толькі праваслаўных беларусаў — ня кажучы аб беларусах каталіках. На жаль, у польскіх гімназіях зусім ня вучаць беларусазнаўства.

Выбраны ў раду Т-ва А. Уласаў, Р. Поржэцкі, А. Більдзюкевіч, Гаўрылік, Рудзь і Тышкевіч.

Апрача гімназіі, Т-ва мае **9** беларускіх народных школ: 1) у Путніках, 2) Вушы, 3) Н. Гуце, Вялейскага пав., ды ў Слонімскім павеце: 4) Пруды, 5) Хіневічы, 6) Чэмеры, 7) Угрынь, 8) Грабава, 9) Савічы. Пры Радашкоўскай гімназіі з дапамогай амэрыканскай місіі мэтадыстаў адчынены інтэрнат для хлапцоў і адчыніцца зараз інтэрнат для дзяўчат.

М. Н.

Гданская справа у Сойме і Сэнаце.

У Сойме.

28 студзеня на пленарным паседжаньні Сойму дэп. Дэмбскі падтрымліваў прапазіцыю камісіі гэткага зьместу:

„Сойм сцьвярджае:

1) што крыніцай і вызначэньнем польскіх дзяржаўных правоў у Гданску зьяўляюцца пастановы Вэрсальскага Трактату;

2) што ўлады в. м. Гданску, усьцяж і незаконна выстаўляючы супраць Вэрсальскага Трактату адменнае разуменьне парыжскае канвэнцыі, варшаўскае ўмовы і пастановаў Высокага Камісара, або ўласнае самавольнае паступаньне, стала імкнуцца да абмежаваньня правоў, прызнаных Польшчы ў Вэрсальскім Трактаце;

3) што, высоўваючы цяпер, супраць выразнае пастановы Вэрсальскага Трактату, зусім адвольнае разуменьне сувэрэннасьці гданскае дзяржавы, — улады в. м. Гданску старэюцца ў-ва ўсіх галінах датарнаваць да гэтага разуменьня істотнае палажэньне і ўхіляць правы, прызнаныя за Польшчай Вэрсальскім Трактатам;

4) што такое, ужо колькігадовае, падкапываньне Вэрсальскага Трактату раўназначна падкапываньню фундамэнту Польшчы, а Польшча з свайго боку хоча бараніць гэты Трактат і, унікаючы ўсялякіх засьцярогаў і імкнучыся да ўладжаньня прадбачаных спорак міравым шляхам, ня хоча нарушаць яго, а жадае бараніць яго праўныя падставы,

— заклікаецца Урад учыніць заходы дзеля правядзеньня істотнага стану рэчаў у суцэльнасьці правоў Польшчы ў Гданску, а гэтым самым істотнага забясьпечаньня Польшчы доступу да мора праз Гданск".

Як бачым, рэзалюцыя ўложана так, што простаму чалавеку трудна дагадацца, у чым тут справа! Аднак, міністар заграгічных спраў п. Скшыньскі яе зразумеў, зрабіў свой вывад з гэтага і заявіў:

Толькі тады адчыніцца беларуская ўрадовая школа з восені 1925 г., калі ў школьным абводзе зьбярэцца дэкляpацыяў на 40 дзяцей і будуць пададзены Школьнаму Інспэктару да 31 сакавіка (марца) гэтага 1925 г. Што і як рабіць, будуць давацца рады праз газэту да 31 сакавіка г. г. Узор дэклярацыі апублікаваны ў газ. „Беларуская Доля“ № 7.

Ц. Б. Ш. Р. Вільня, Віленская 12—6.

Праз вусны прадстаўнікоў партыяў вялізарная большасьць Сойму і Народу высказала сваё абурэньне, а згэтуль і сваю волю паказаць сьвету, як адчувае і разумее Польшча зачапленьне якога-хоч пункту Вэрсальскага Трактату. Урад усьведамляе сабе важкасьць мамэнту і сваей адказнасьці пад націскам лёгікі выпадкаў, а з другога боку—высказанага Соймам жаданьня. У польска-гданскіх адносінах вырашаць будзе права.

Большасьцяй галасоў (без П.П.С. і „нацыянальных меншасьцяў“) прапазіцыя камісіі Соймам прынята.

У Сэнаце.

У той-жа дзень на паседжаньні Сэнату прынята рэзалюцыя, якая заклікае Урад,

1) каб скасаваў усялякія палёгкі, аблягчаючыя прывоз і вываз цераз Гданск;

2) каб—у мысьль арт. 206 і 242 варшаўскае канвэнцыі — загадаў ураз-жа адмену крыўднага для Польшчы падзелу мытных аплат паводле лічбы душ насяленьня,—г. ё. у адносінах 1 да 1, а не 1 да 6;

3) каб—па-за істнуючымі ўжо забавязаньнямі—не рабіў у Гданску ніякіх закупаў ані заказаў на патрэбы польскіх чыгунак на тэрыторыі Рэчыпаспалітай;

4) каб прысьпешыў будоўлю порту ў Гдыні, і падаў недкладна ў Сойм праект уставу, які забясьпечыў-бы шыбкую будоўлю польскага тарговага флёту;

5) каб у магчыма хуткім часе наладзіў чыгункавую лучнасьць з Гданскам праз тэрыторыю Рэчыпаспалітай;

6) каб неадкладна — з увагі на ўзрост кантрольнае перавозкі тавараў з боку Гданску—узмацаваў на польска-гданскай граніцы варту і на падмогу ёй паслаў дзяржаўную паліцыю;

7) каб, з прычыны вядомага ўсім падтрымліваньня кантрабанды гданскімі мытнымі ўрадоўцамі, наладзіў мытную станцыю для перасыланых з заграніцы ў Польшчу тавараў на польскай тэрыторыі, а адначасна каб зарганізаваў належны мытны кантроль гданскімі ўладамі;

8) каб зьвярнуў асаблівую ўвагу на варожую заграничную прапаганду ў гданскай справе.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаемаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Палітычны агляд.

У Польшчы.

Сьмерць пасла З. Сэйды.

У Варшаве памёр віцэ-старшыня Сойму п. Зыгм. Сэйда, брат вядомага эндэка, былага „міністра загран. спраў“—Мар'яна Сэйды.

Пастанова канвэнту сэньёраў.

Конвэнт сэньёраў пастанавіў, пакуль камісія будзе працаваць над бюджэтам, склікаць агульныя паседжаньні Сойму толькі ў выпадку канешнай патрэбы.

Арышт пятлюраўскага міністра.

20 студня, як пішуць польскія газэты, у Варшаве паліцыя арыштавала б. міністра ў габінэце атамана Пятлюры, нейкага Пінхоса Краснага (?), які абвінавачываецца ў шпіёнстве на карысьць Радавай Расеі (?).

Конная дывэрсыйная банда.

„Robotnik“ наказуе, што ў раёне Кукавічаў, каля Клецку, 26 студня пераехала цераз граніцу група конных людзей у цывільных вопратках — з боку С. С. Р. Р. Спаткаўшыся з патрулём пагранічнікаў, банда павярнула назад.

Новыя банды.

„Robotnik“ піша, што па весткам, якія даходзяць з пагранічча, быццам за кардонам рыхтуюцца новыя вялікія банды і напады.

Паміж іншым, у Магілянах месьціцца банда з 100—150 чалавек—з Мухай-Міхальскім і Янам(?) Качаном на чале, якія быццам ужо... заключылі кантракт (з кім?) аб тым, што ўсё зрабаванае мае быць уласнасьцю ўчасьнікаў нападаў...

Заграніцай.

Праект статуту „Польскай Нацыянальнай Рады“ ў Літве.

19-га сьнежня 1924 г. Польскі Клюб ў Ковенскім Сойме апрацаваў і падаў у Сойм праект статуту „Польскай Нацыянальнай Рады“ ў Літоўскай Рэспубліцы.

Галоўныя рысы гэтага цікавага праекту—гэткія:

Польскую Нацыянальную Раду выбірае Польскае Нацыянальнае Сабраньне, сябры якога выбіраюцца ўсімі літоўскімі грамадзянамі польскай нацыянальнасьці—шляхам агульнага, роўнага, тайнага і простага галасаваньня, па сыстэме прапарцыянальных выбараў (як адбываліся выбары і ў польскі Сойм, а таксама і ў літоўскі).

Старшыня Польскай Нацыянальнай Рады прымае ўчасьце у паседжаньнях габінэту міністраў з правам дарадчага голасу.

У межах загарантаваных Канстытуцыяй правоў для меншасьцяў — Польская Нацыянальная Рада мае права выдаваць абязываючыя пастановы для ўсіх сяброў польскай меншасьці.

Польская Нацыянальная Рада вядзе на мясцох рэгістрацыю (сьпіскі) грамадзян палякоў, адкрытыя для праверкі і папраўак заінтарасаванымі асобамі.

Нацыянальная Рада мае правы юрыдычнай асо-

Заграничныя даўгі Польшчы.

Польская Рэспубліка вінавата другім дзяржавам гэткія сумы:

Амэрыцы — 178 міліёнаў 565 тысяч даляраў, або блізу 926 **міліёнаў злотых;**

Францыі — 891 міліён 105 тысячаў франкаў, або блізу 249 **міліёнаў злотых;**

Англіі — 5 міліёнаў фунтаў, або 122 **міліёны злот**.;

Італіі — 469 міліёнаў ліраў, або звыш 108 **міліёнаў злот.**;

Галяндыі — 9 міліёнаў 89 тысяч флярэнаў, або больш за 18 **міліёнаў злот.**;

Нарвэгіі — 16 міліёнаў 497 тысяч карон, або блізу 12 **міліён. злот.**;

Швэцыі — 5 міліён. 106 тысяч карон, або звыш 7 **міліён. злот.**;

Даніі — 358 тысяч карон, або звыш 301 **тыс. злот.**;

Швайцарыі — 73 тысячы 600 франкаў, ці **каля 72 тысяч злот.**

А ўсяго разам — **каля паўтара міліярда злотых.**

На аплату працэнтаў і надплату даўгоў у 1925 г. Польшча празначыла $57 \frac{1}{2}$ міліёнаў злотых, у тым ліку аднэй толькі Амэрыцы выпадае 13 міліёнаў злотых.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць яшчэ **$4 \frac{1}{2}$ мільярды залатых марак** доўгу, які Польшча павінна выплаціць, як заплату за нямецкую і аўстрыйскую дзяржаўную маемасьць на адышоўшых да Польшчы землях Нямеччыны і Аўстрыі, як сплату часьці нямецкіх даўгоў, што прыпадаюць на гэтыя-ж землі, і як польскую часьць „вызвольнага“ доўгу дзяржаў-насьледніц Аўстрыі.

бы, мае права рабіць усялякія праўныя акты, (купляць нярухомасьці і рухомасьці, прадаваць і г. д.).

Гэты праект быў ужо раз прадстаўлены Польскім Клюбам у 1923 г. ўраду Гальванаўскаса, але той у Сойм праекту не падаў.

„Robotnik“, падаючы гэты праект, дадае, што ў Літве дагэтуль урад не зрабіў нічога, каб правясьці ў жыцьцё артыкулы Дзяржаўнае Канстытуцыі Літвы і яе ўрачыстай дэклярацыі перад Лігай Народаў — у справе правоў меншасьцяў. Гэтыя правы не зрэалізаваны ў Літве...

А ў Польшчы?

Нядаўна праф. Казлоўскі, адзін з вельмі нячысьленых „у нашыя часы запраўды шляхотных мысьліцеляў у Польшчы“, у сваіх лекцыях у Празе казаў, што польская нацыянальная думка мае тое агульналюдзкае, — сусьветна-гістарычнае значэньне, што выпрацавала найпэўнейшыя, дасягаючыя мэты і нармуючыя душу мэтады нацыянальнага разьвіцьця і вызваленьня наагул, якімі пасьля можа ўжо карыстацца лёгка кожны народ, які таксама паняволены і таксама вядзе барацьбу за волю і незалежнасьць, як польскі.

Дык вось, калі гэта праўда, але ня „blaga“, дык няхай варшаўскія супляменьнікі пражскага прафэсара і літоўскіх палякоў—дадуць беларускай меншасьці ў Польшчы тое, чаго палякі дабіваюцца для сябе ад ковенскага ўраду ў Літве!

Камісія Сойму адкінула аднагалосна праект Польскай Нацыянальнай Рады, выпрацаванай польскім Соймамвым Клюбам.

Адмова матывавана тым, што нацыянальная аўтаномія дапускаецца канстытуцыяй толькі дзеля буйнейшых нацыянальных меншасьцяў, а палякоў у Літве, згодна з статыстыкай,—толькі каля 3 працантаў.

Словы і учынкі польскае дэмакратыі у справе „Крэсаў“.

Гэтымі днямі адбылася ў Варшаве даволі цікаўная „зборная лекцыя“ ў справе—усё тых-жа „нястраўных“ „Усходніх Крэсаў“.

На гэтую нястраўную, — негыгіенічную тэму (шкодную для здароўя) зрабіў веча ў салі „Towarzystwa Hygjenicznego“ „Саюз Незалежнай Сацыялістычнай Моладзі“,—так сказаць—„пэ-со-мольцы“.

Выступілі на вечы з дакладамі тры (відаць, найстарэйшыя?) прадстаўнікі польскай „незалежнай сацыялістычнай моладзі“ — былы міністар Л. Васілеўскі і паслы: Недзялковскі і Прагер.

Пан Васілевскі казаў агульна аб справе меншасьцяў у Польшчы і ў іншых дзяржавах, аб гэтым вельмі балючым у Эўропе пытаньні, калі ня створаным, дык завостраным тым самым Вэрсальскім „мірам“, які быццам меў аднэй з мэтаў вырашыць яго.

Слушна аўтар пералічывае ўсе „ірэдэнты“, якіх нарабіў Вэрсальскі Трактат—у дадатак да істнаваўшых раней. Але зусім няслушна ён ставіць у адзін рад гэткія рэчы, як „kwestja“ каталёнская ў Гішпаніі, ці ў Фінляндыі—швэдская і — справу „ўсходніх крэсаў“ Польшчы. Трэба наагул сцьвярдзіць, што нідзе ў Эўропе, нават на Балканах, ані ў Турэччыне няма, калі ня гэткай вастраты, дык ужо бясспрэчна гэткіх разьмераў, гэткага народна-тэрыторыяльнага маштабу, гэтага зьявішча, гэтай агульна-эўрапэйскай хваробы, як у Польшчы!..

Бясспрэчна,—нідзе ў іншым мейсцы Эўропы няма таго, каб **„меншасьцямі“ лічылася і адпаведна трактавалася ў дзяржаве цэлая траціна яго насяленьня**, каб да этнаграфічна-тэрытарыяльнага ядра дзяржавы была далучана роўная ёй этнаграфічна чужая тэрыторыя.

І калі, як кажуць філязофы, **якасьць** ёсьць вынікам (функцыяй) **колькасьці**, дык можна сказаць, што „справа меншасьцяй“ у Польшчы стаіць зусім асобна і амаль не адзінока паміж усімі пералічанымі п. Васілевскім, як зусім „арыгінальнае“ зьявішча. Дзеля гэтага нашая „крэсавая хвароба“ перад усім пагражае агульна эўрапэйскай „гыгіене“...

Ці-ж можна, запраўды, казаць, як казаў п. Васілевскі, што нашая „крэсавая меншасьцёвая балячка створана дзеля таго, што цяжка было „зусім дакладна сумясьціць этнаграфічныя граніцы з граніцамі дзяржаўнымі“?—Ня можна-ж пры правядзеньні этнаграфічна-дзяржаўных граніцаў рабіць „недакладнасьці“ ў сотні тысячаў квадратных кілямэтраў і ў дзесятак мільёнаў „недзяржаўна-этнаграфічнага“ нясяленьня!..

Аратар слушна нарысаваў агульную гістарычную тэндэнцыю паступовага, чарговага вызваленьня і саматварэньня ў этнаграфічна-дзяржаўных граніцах **народаў**, тварэньня імі ўласных **нацыянальных гаспадарстваў.** Але-ж якраз тое, што зроблена — быццам пад лёзунгам гэтай агульна-людзкай эвалюцыі — у выпадку Польшчы, гэта рашуча і прынцыпова пярэчыць духу і зьместу гэтай эвалюцыі.

Гістарычна чарговаму вызваленьню Польскага народу, стварэньню ім сваей **нацыянальнай** дзяржавы кожны народ і кожны воле любівы чалавек павінен толькі спагадаць і радавацца. Але справа ў тым, што ў „заходнім Вэрсалі“, а пасьля яшчэ ў другім „усходнім Вэрсалі“ (ў Рызе) зроблена нешта якраз **пагражаючае гэтаму вызваленьню**, гэтай волі польскага народу.

Аратар слушна кажа, што ў выніку нацыянальна-дзяржаўнага ўнезалежненьня народаў—„зьмяншаецца агульная сума нацыянальнага ўціску, але астаецца ўціск некаторых нацыянальных адрэзкаў, якія не ўвайшлі ў межы ўласнай нацыянальнай дзяржавы“.

Але, калі,—як сцьвярджае з лічбамі і фактамі ў руках ў вядомай кніжцы італьянскі палітык Нітті, — **агульная сума нацыянальнага** ўціску і гвалту ў выніку „Вэрсальскай Канстытуцыі“ „Новай Эўропы“ ня толькі ня зьменшылася, але, наадварот, яшчэ павялічылася; калі гэтыя „нацыянальныя адрэзкі“, аб якіх, як быццам аб запраўды дробных кавалках, кажа п. Васілевскі, мерацца, як мы казалі, дзесяткамі тысяч кілямэтраў і мільёнамі насяленьня,—тады ўся справа зьмяняецца — пераварачываецца ўверх нагамі.

Зусім слушна казаў п. Васілевскі, што гэтыя „нацыянальныя адрэзкі“ агульная палітыка змушана аддаць на ахвяру дзеля мэтаў палітычных (?), стратэгічных, эканамічных, камунікацыйных і г. д.

Але, што трэба рабіць, калі гэтая „ахвяра“, не даючы, як у даным канкрэтным выпадку, ніякіх карысьцяў ці выгад камунікацыйных і эканамічных, — „палітычна“ і „стратэгічна“ толькі... выклікае грозныя канфлікты, якія гэтая „ахвяра“ мела мэтай зьліквідаваць?..

„Вызваленьне (wyjarzmienie) таго ці іншага народу наступае **заўсёды** ў рэзультаце вайны“—слушна сказаў аратар. Дык вось, найгоршае вырашэньне — у выніку міра—праблемы нацыянальна-дзяржаўных граніцаў—якраз тое, якое гэтую вайну ня толькі ня ўхіляе зусім, але, наадварот, робіць нямінучай і блізкай.

Дэмакратыя, якая перад усім ня хоча вайны,—казаў аратар, павінна знайсьці такі выхад для разьвязаньня справы меншасьцяў, які-б павёў да мэты—**без давядзеньня да вайны**.

На гэта трэба адказаць, што тэарэтычна гэта, можа, і магчыма, калі гэтыя „адрэзкі“ не дасягаюць некаторай велічыні і... вышыні нацыянальнай сьвядомасьці. А другое—калі гэтая дэмакратыя мае запраўдную шчырасьць і сілу ў „сваім паньстве“, — у кожным выпадку... большую, як гэта маюць паны польскія дэмакраты. І найслушней сам лектар сцьвярджае, што ўсе тыя дэмакратычныя „формулы аховы меншасьцяў“, якія створаны на канфэрэнцыі ў Парыжу (ў Вэрсальскім і інш. трактатах)—нідзе, а перад усім у Польшчы—не выпаўняюцца.

Яшчэ слушней сцьвярджае аратар, што ўся праблема польскіх меншасьцяў кампліктуецца яшчэ ў тым, што „жыхары гэтых крэсавых адрэзкаў сілай рэчаў цягнуцца да сваіх братоў па за граніцамі Польшчы“.

ГРАМАДЗЯНЕ! дамагайцеся для сваіх дзетак роднай беларускай школы!

Пэпэсаўцы ў Гданску.

Пэпэсаўскія паслы Лібэрман і Жулавскі прыехалі ў Гданск — дзеля перагавораў з мясцовымі сацыялістамі ў справе канфлікту Гданску з Польшчай.

Прамова Рыкава.

На агульным зьезьдзе вучыцялёў у Маскве старшыня В.Ц.І.К-у Рыков у абшырнай прамове заявіў, што „камуністычная партыя паставіла сабе мэтай—вызваленьне ўсіх паняволеных народаў. Фэдэрацыя ССРР ня толькі тэарэтычна паставіла сабе гэтую мэту, але і фактычна праводзіць яе ў жыцьцё, карыстаючыся ўсемі даступнымі ёй спосабамі.

Замах на патрыарха Ціхана.

У Маскве 23 студня ў часе багаслужэньня нейкі чалавек зрабіў замах на патрыарха Ціхана. Замах быў папярэджаны мітрапалітам Пятром, які здалеў схапіць за руку праступніка. Ад узварушэньня патрыарх захварэў.

Францыя і ССРР.

Дакладчык бюджэтнай камісіі францускага парляманту ў сваім дакладзе заявіў, што Францыя ўзнавіла зносіны з Расеяй, дзеля трох прычын:

1) канешнасьці палітычнага супрацоўніцтва з прыяцелямі Францыі на Усходзе,

2) урэгуляваньня справы „абыватэльства“ расейскіх эмігрантаў,

3) прыняцьця 130 міл. насяленьня ССРР да эўрапэйскага гаспадарскага адзінства...

Дакладчык сьцьвярдзіў, што нота Францыі аб прызнаньні ня ставіла ніякіх варункаў. Што датычыць заявы ўраду ССРР, што ён мае паўнамоцтвы прадстаўляць і бараніць перад Францыяй інтарэсы Кітаю і Манголіі, дык гэтыя дамаганьні ня могуць быць прызнаны Францыяй.

Уканцы дакладчык п. Сімон заявіў, што на зварот расейскіх прыватных даўгоў францускім грамадзянам няма ніякай надзеі...

Апошняя заява выклікала жывы пратэст прысутнага прэм'ера Эрыо, каб... не адбіраць надзеі і веры тым, хто працуе ў Маскве ў справе гэтага звароту даўгоў...

Амэрыка і японска-расейская ўмова.

Амэрыка вельмі ўстрывожана ўмовай паміж Японіяй і ССРР, і лічыць гэты крок Японіі выразным пераходам у лагер, воражы да Злучаных Штатаў

Новы праект „гарантыяў“.

Француская газэта „Echo de Paris“ піша, быццам новы нямецкі ўрад мае запрапанаваць Францыі зусім новы і вельмі арыгінальны праект так патрэбных Францыі „гарантыяў“ ад нападу з боку Нямеччыны: гэтыя гарантыі дасьць сама Нямеччына, але толькі... на 30 гадоў... Немцы гарантуюць Францыі яе граніцы, але рашуча адмаўляюцца гарантаваць польскія граніцы...

Газэта піша, што ў Нямеччыне сьвядома і напэўна чакаюць на няўхільную ўнутраную разруху ў Францыі, якую мае выклікаць фінансавая палітыка францускага ўраду. І тады будзе добры мамэнт для захвату Гданску і польскага Сьлёнску...

Немцам газэта радзіць зразумець, што Францыя згаджаецца на праект, але трэбуе такіх-жа гарантыяў для Польшчы...

Казка пра белага бычка...

Новая нота саюзьнікаў.

Саюзьнікі паслалі Нямеччыне новую ноту з пагрозай рэпрэсіямі, калі нямецкі ўрад не забароніць заводу Круппа выпаўняць заказы для аргентынскага флёту,—бо гэта супярэчна з Трактатам.

Нямецкая гісторыя сусьветнай вайны.

Нямецкі дзяржаўны архіў выпусьціў 2 першыя томы вялікага выданьня „Сусьветная вайна 1914 — 1918 г. г.“.

Францускія даўгі Амэрыцы.

Амэрыка моцна націскае на Францыю,каб яна прыступіла нарэшце да ўрэгуляваньня сваіх даўгоў.

Дагэтуль усе прапазіцыі і праекты Францыі адкідаліся амэрыканскім урадам. 27 студня Эрыо меў зрабіць заяву ў гэтай справе ў парляманце.

Мэдыцынска-палітычны нагляд за Мусоліні.

Цэнтральная Рада фашыстаў пастанавіла наладзіць за Мусоліні спэцыяльны нагляд, бо ў апошнія дні il duce (правадыр) стаў выяўляць азнакі паступовага паралiжу (сухоткі мозгу!) і ўмысловае хваробы (спадчына па вясёлай моладасьці).

Гэткім чынам сам правадыр узяты партыяй пад апеку...

Забойчае запярэчаньне.

Італьянскае пасольства ў Капэнгагене (сталіца Даніі) афіцыяльна „прастуе“ вестку, аб тым, што прэм. Мусоліні... звар'яцеў...

Паліцэйскі тэрор у Харватыі.

Звольненыя з вастрогу па загаду судовых уладаў сябры харвацкай рэспубліканскай сялянскай партыі зараз-жа па выхадзе з няволі ізноў усе арыштаваны паліцыяй, якая знайшла зараз жа ў іх новыя праступленьні — ужо ўгалоўныя...

Дакумэнты дзяржаўнай здрады Радіча.

Урад Пашыча публікуе цэлы рад дакумэнтаў, даводзачых дзяржаўную здраду Радіча і яго перагаворы і ўмовы з радавым урадам і „Сялянскім Інтэрнацыяналам“ у Маскве.

Брантінг падаўся ў адстаўку.

Вядомы ўсяму сьвету палітычны і грамадзкі дзеяч, швэдзкі сацыяліст Брантінг, былы прэм'ер і прадстаўнік скандынаўскіх дзяржаў у Лізе Народаў, падаўся ў адстаўку. На яго месца прэм'ерам швэдзкага ўраду назначаны Зандар.

Брантінга гарачым і добрым словам заўсёды будуць успамінаць усе пакрыўджаныя народы, якія неўваходзяць у Лігу „Народаў“ — бо, здаецца, ці ня ён адзін быў у Лізе запраўды і да канца шчырым абаронцам іх правоў — проці тых дзяржаўных жываедаў, якім яны аддадзены Антантай.

Яшчэ пара жэньне гішпанцаў.

У апошнія дні гішпанцы ў Марокко ізноў дазналі яжкага паражэньня. З атраду ў 500, душ пачаўшага цаступленьне проці анджэраў, вярнулася жывымі толькі—200.

Англійцы ў Судане.

Англійскі камісар у Ягіпце паведаміў ягіпецкага прэм'ера аб тых „мерах“, якія апрацаваў англійскі губэрнатар у Судане ў справе абароны краю пасьля вываду з яго ягіпецкіх войск.

Ягіпецкі ўрад у сваім адказе з больлю сьцьвярджае абражаючы і крыўдны дзеля годнасьці і інтарэсаў Ягіпту характар гэтых мераў і заяўляе, што, ня гледзячы на ўсё, няма такое сілы, якая-б разарвала сувязь паміж Ягіптам і Суданам.

„Перадышка“ пад Шанхаем.

З Лёндану даносяць, што ваюючыя пад Шанхаем кітайскія арміі зрабілі 24 студня перадышку на адзін тыдзень у зьвязку з сьвятам кітайскага новага году.

Чарговая „рэвалюцыя ў Чылі.

У Чылі (у паўдзённай Амэрыцы) ахвіцэры зрабілі чарговую „рэвалюцыю“, скінуўшы ўрад. Выбрана „Хунта“ (дырэкторыя“) з 3 асоб: адмірала, генарала і аднаго „цывіля“. „Паўстанцы“ зьвярнуліся да выгнанага нядаўна прэзыдэнта Алессандрі, які жыве ў Рыме, з просьбай вярнуцца назад і быць далей прэзыдэнтам рэспублікі.

Алессандрі згадзіўся, але паставіў варункам, каб неадкладна быў створаны цывільны ўрад, які вызначыць новыя выбары народнага сабраньня для апрацаваньня новай канстытуцыі.

ХРОНІКА.

Беларуская мова на матуральных экзаменах. „Dz. Wil.“ паведамляе, што Міністэрства Асьветы дазволіла вучням-беларусам на матуральных экзаменах даваць адказы ў беларускай мове па ўсім прадметам курсу, апрача паляністыкі, гісторыі і географіі.

Паштовыя баламуцтвы. Нядаўна ў газэтах зьявілася ўрадавае апавяшчэньне аб пісаньні адрасоў на паштовай карэспандэнцыі. Апавяшчэньне гэтае напісана так, каб яго, мусіць, ніхто не зразумеў! Бо-ж запраўды: ў ім было сказана, што адрасы трэба пісаць папольску, пры гэтым-жа назоў мясцовасьці павінен быць напісаны... папольску! Калі абавязкова трэба пісаць папольску назоў мяйсцовасьці, дык з гэтага лягічна выцякае, што ўсё іншае неабавязкова пісаць у дзяржаўнай мове,—інакш кажучы, імя адрасата і падрабязны адрас могуць быць пісаны і пабеларуску.

Гэтак зразумела ўрадавае апавяшчэньне і публіка, і шмат хто з урадоўцаў пошты. Пасыпаліся пісьмы з беларускімі адрасамі. Але праз нейкі час начальнік віленскае паштовае канторы забараніў ўрадоўцам сваім прымаць заказныя пісьмы

Ня спыняемся ўжо на тым, што ў канцы шаноўны прадстаўнік польскай сацыялістычнай моладзі паўтарае, здаецца, ужо каля 20 гадоў,—аб „нізкай ступені нацыянальнае сьвядомасьці беларускага народу“, аб „туманнасьці паняцьця аб беларускай нацыі“, якое йшчэ „няма“, а ёсьць толькі сялянская маса „тутэйшых“ і г. д. Усё гэта, можа, і **было** вельмі „актуальна **20 гадоў** назад, але не цяпер.

Пераходзім далей да прамовы п. Недзялковскага, які даў нарыс „гісторыі польскай палітычнай думкі адносна да ўкраінскай і беларускай праблемы“, а справядлівей — гісторыі няшчырага жаданьня, але, затое шчырага бяссільля польскай лявіцы зрабіць хаця дробную частку з усяго таго, аб чым яна „думала“, а прынамся—прамаўляла і дакляравала.

У часе вайны і зараз пасьля вайны польская дэмакратыя высунула так-званую „фэдэрацыйную праграму“, якая імкнулася да стварэньня **фэдэрацыйнай польска-украінска-беларускай рэспублікі**“.

Гэткая, як казаў шчыра аратар, **была** праграма польскай дэмакратыі.

„У нейкі пэрыяд фэдэрацыйную праграму (гэтую?) прыняла, як сваю, уся польская палітычуая думка (!), бо нават правыя партыі падпісалі—у 1917 г. (!) адозву, сьцьвярджаючую, што воляй і мэтай Польшчы ёсьць утварэньне гэткай Фэдэрацыйнай Рэспублікі. Але **пасьля атрыманьня незалежнасьці** (курсіў наш), правыя партыі зыйшлі з гэтага становішча“...

Так заўсёды й бывае: пакуль справа „ў думцы“— адно, а калі дайшло да „дзела“, — дык зусім што другое...

І вось, правыя партыі адмовіліся ад фэдэрацыі— пасьля атрыманьня з рук „антанты“ (Францыі) незалежнасьці Польшчы і — з тых-жа рук „мандату“ на беларускія і ўкраінскія тэрыторыі. — Пакуль ня мелі нічога, дык сулілі ўсё, але, як толькі атрымалі сваё, дык працягнулі рукі й на чужое...

Але аратар казаў далей, што левыя партыі — польская дэмакратыя — зрабілі тое-ж самае з „сваей“ фэдэрацыйнай праграмай — толькі крыху пазьней за правых...

Аратар шчыра прызнаецца, што, калі Пілсудскі пачаў займаць украінскія і беларускія абшары, пачаў рабіць „facty dokonane“, дык тады ўжо аб гэтай фэдэрацыйнай праграме „nie myślano“... І гэта, паводле аратара, было абмылкай...

Але—пасьля Рыжскага міру даўная фэдэрацыйная праграма страціла зусім усялякі сэнс істнаваньня, дзеля таго, што **абшары, якія зьяўляюцца цэнтрамі крэсавых нацыянальнасьцяў (украінцаў і беларусаў), асталіся па-за межамі Польшчы...**

Можа, аратар прызнае ўжо і далейшы вывад з яго-ж слоў: што разам з гэтымі цэнтрамі астаўся па-за межамі Польшчы і там знайшоў увесь страчаны ў Польшчы сэнс істнаваньня і ўвесь „program federacyjny“... Але на гэты, здавалася-б, канешны вывад унікаючая вайны, паводле п. Васілеўскага, польская дэмакратыя, відаць, не згаджаецца... Бо п. Недзялковскі заяўляе, што яна „не адраклася зусім ад фэдэрацыйнай праграмы — „на далейшы час“, — але толькі лічыць яе ў сучасным укладзе сіл — нерэальнай“, а да таго-ж — яшчэ і „пагражаючай вайной з Расеяй“. „А ўсё, што пагражае нарушэньнем міра, — абсалютна недапусьціма“. Дзеля таго польская дэмакратыя можа мысьліць аб вырашэньні крэсавых спраў, толькі не нарушаючы Рыжскага Трактату“.

Дзеля таго аратар прапануе стварыць для меншасьцяў у межах сучаснай Польшчы такія формы сужыцьця, якія гарантавалі-б ім ня толькі апеку дзяржавы і роль пасыўнага чыньніка ў краю, але і актыўнае ўчасьце ў будове і кіраваньні ўсім дзяржаўным жыцьцём Польшчы. Аратар меў на думцы апрацаваныя PPS праекты аўтаноміі.

Аб гэтай „аўтанамічнай праграме польскай лявіцы“, якая замяніла „program federacyjny“, казаў на вечы пасол Прагер.

Надзвычайна цэннае прызнаньне зрабіў ён у самым пачатку прамовы: ён адзін з лідэраў П.П.С., шчыра прызнаўся, што „Рыжскі Трактат быў якраз **кампрамісам** паміж прынцыпова рознымі спосабамі вырашэньня крэсавага пытаньня — спосабам **ператравеньня** крэсавых нацыянальнасьцяў... праграмай фэдэрацыйнай“.

І вось, на гэты „кампраміс“ — забойства (бо-ж „стравеньня!“) з жыцьцём, — на кампраміс „з жываедамі — эндэкамі і пайшла гуманна-мілітарыстычная польская „дэмакратыя“. П. п. Недзялковскі, Васілеўскі Домбскі і інш. — былі першымі „разьнікамі на рыжскай „бойні“...

Аратар дзеля таго прызнае, што „пры разьвязаньні крэсавай праблемы палякі павінны лічыцца з тым, што **насяленьне** выходзіць сваімі пачуцьцямі па-за межы Польшчы — да сваіх братоў, якія знаходзяцца пад уплывам крывадушнай, але дасягаючай мэты палітыкі Расеі“...

І, запраўды, забойчым акордам было напамінаньне прамоўцы, што „неляяльныя“ цяпер меншасьці „далі доказ сваёй ляяльнасьці адносна да польскай дзяржавы на пачатку гэтага Сойму, падаючы галасы за прэзыдэнта разам з польскай дэмакратыяй“ (Дый нават і за **ўрад** п Сікорскага!).

„Далі гэтым сьвядэцтва таго, што якраз ад польскай дэмакратыі чакаюць вырашэньня сваіх спраў“...

„Чакаюць“? — Не: хіба „чакалі“! Праўда, было гэткае „lekke pamiętanie“...

Наагул трэба прызнаць, што „гісторыя палітычнай... impotencji (бяссільля) — як у думках, так яшчэ больш — **у дзейнасьці** польскай дэмакратыі“ дадзена аратарамі на варшаўскай „зборнай лекцыі“ вельмі ярка і дакладна“.

М.

† КСЕНІЯ КРАСІНСКАЯ.

Праўдзівая веліч душы выяўляецца ня тольні ў вялікіх дзеяньнях, што імя ўчыніўшага іх услаўляюць на ўсенькі сьвет. Веліч душы крыецца ня менш часта ў тых ціхіх, нявідочных грамадзкіх працаўнікох,якія, быццам маленечкія колцы ў вялізарнай усенароднай машыне, зьяўляюцца абсалютна неабходнымі дзеля руху гэтае машыны.

Да такіх ціхіх, нявідочных адзінак, што працай жыцьця свайго выявілі веліч душы, належыць і зышоўшая без пары на 26-ым годзе жыцьця Ксенія Красінская. Сухоты, люты вораг нашае маладое народнае інтэлігенцыі, скасілі і Яе, як цэлы рад другіх беларускіх ідэйных працаўнікоў.

Красінскую ведалі добра ўсе нашы мастакі—артысты, якія працавалі разам з Ёй пры будове нашага тэатру ў Вільні. Яна была аднэй з найбольш жывых работніц Беларускае Драматычнае Майстроўні, закладзенае братам Яе,—Мікалаем. Яна выступала і на сцэне, і працавала неўтамімa—паскольку пазваляла здароўе—у галіне арганізацыі нашага тэатру.

А побач з гэтым, захопленая беларускай ідэяй, яна аддавала нязьлічаныя дробныя, але, ня гледзячы на гэта, нязвычайна цэнныя ўслугі беларускай грамадзкай і палітычнай рабоце,—услугі, якія ня твораць іменьня, але памагаюць тварыць дзела. І аб гэтых услугах ведалі толькі найбліжэйшыя да Яе.

Ідэалістка па прыродзе,—„не от мира сего“,—Яна тым болей адыходзіла ад асабістых, эгоістычных спраў, што вечная пагроза перадчаснае сьмерці забівала ў Ёй радасьць жыцьця, магчымасьць карыстацца гэтым жыцьцём для сябе.

Нязвычайна цяжкія матарыяльныя варункі жыцьця не давалі, як сьлед, бароцца з хваробай. Урэшце надумалася Яна ў мінулую восень перабрацца за кардон, спадзяючыся папасьці на палудзень—у Крым, каб у тамтэйшым цёплым і мягкім клімаце паправіць здароўе і набрацца новых сіл.

Ды плян гэты ня ўдаўся. Яе вярнулі назад у Вільню, а перажытыя маральныя і фізычныя турботы аканчальна зламалі Яе кволы арганізм. Ёй прышлося легчы ў бальніцу — у „Мішмэрэс Хойлім“, дзе ў ноч з 25 на 26 студня Яна і памерла.

На пахароны Яе сабралася даволі вялікая грамада віленскіх беларускіх дзеячоў, якія і праводзілі Яе на Еўфрасінеўскі магільнік, дзе зложылі цела Яе ў „беларускім кутку“— побач з магілкамі беларускіх вучняў, Калаўра і інш.

Хай лёгкая будзе Ёй родна зямелька!

А. Н.

з беларускім адрасамі, а зварчаўшымся да яго беларусам заявіў, што і за дастаўку адрасатам простае карэспандэнцыі з беларускімі адрасамі пошта на сябе адказнасьці не бярэ.

Што ўсё гэта знача?

Калі ўрадавае апавяшчэньне нічога не зьмяняе ў істнаваўшым дагэтуль прымусе пісаць увесь адрас папольску,—дык навошта-ж гэная гутарка аб абавязковасьці пісаньня папольску-ж назову мяйсцовасьці? Ці гэта, мо‘, зроблена, як і шмат іншых папяровых „свабод“, дзеля вывазу заграніцу, а адначасна паштовым установам загадана рабіць усё пастараму?

Можа-б нашы паслы заняліся гэтай справай і высьнілі ў Варшаве, што гэта за баламуцтва?

Перамаляваліся. Як ведама, камісар ураду п. Вімбор, адмовіўся зацьвярдзіць статут Беларускага Клюбу, які падалі вядомыя прадстаўнікі беларускага грамадзянства з дырэктарам Гімназіі Р. Астроўскім на чале. Пры гэтым п. Вімбор заявіў, што клюбаў у Вільні ўжо залішне многа.

Ня гледзячы на такую заяву, той-жа п. Вімбор зацьвярдзіў—як піша „Грам. Голас — статут новага „беларускага“ клюбу пад назовам „Віленскі Беларускі Клюб“, які гэтымі днямі пачне сваю чыннасьць.

Новы клюб — той тэй-жа валэйшаўскае банды, якая вяла шулерню пад назовам „Беларускае Грамадзянскае Сабраньне“. Пасьля аканчальнае кампрамітацыі гэнага прытону крыміналістаў у сувязі з выкрытымі зладзействамі, учыненымі вышэйшымі ўрадоўцамі віленскае паліцыі куратарыюму—сталымі гасьцьмі шулерні, — валэйшаўская банда, як відаць, пастанавіла „перамаляваць вывеску“. І вось віленская адміністрацыя, забараніўшая беларускаму грамадзянству стварыць свой запраўдны клюб,—гэтым разам не палічыла, што „клюбаў у Вільні зашмат“, і дала канцэсію на новы ігорны прытон...

У праваслоўнай духоўнай сэмінарыі. На месца звольненага няўдзячнай уладай ініцыятара спольшчаньня сэмінарыі, архімандрыта Піліпа Марозава, назначаны былы вучыцель валынскае сэмінарыі Тучэвскі.

Падзяка. Мір. Гуртку Аматараў Артыстаў. 20 злоты, як ахвяру для дзіцячага прытулку, атрымалі. Шчыры і вялікі дзякуй.

Камітэт Белар. Т-ва помачы пац. ад вайны.

„Арышт шпіёнскай банды“. „Dz. Wil.“ піша, што паліцыя арыштавала ў Празароцкай гміне, Дісьненскага павету, 20 асоб, якія займаліся шпіёнствам на карысьць Радавай Расеі. Сярод арыштаваных была нейкая Шчэнсновіч, якая ў часе паяўленьня паліцыі прыняла атруту і памёрла.

Цэнтральная Беларус. Школьная Рада.

гэтым паведамляе вучыцялёў, якія склалі анкету ў Ц.Б.Ш.Р. і наагул зацікаўленых беларускімі вучыцельскімі курсамі, што—

1) Урад мае адчыніць беларускія вучыцельскія курсы ў **Кракаве на 40 слухачоў** і ў **Вільні** пры Куратарыюме Віленскага Школьнага Вокругу **на 40 слухачоў**;

2) Дзеля таго, што курсы адчыняюцца ўрадам, то асобы, якія жадаюць паступіць на курсы ў Вільні, могуць скласьці ў Куратарыюме Віленскага Школьнага Вокругу заяву аб залічэньні на курсы з адпаведнымі дакумэнтамі; а копію заявы абавязкава прысланць у Цэнтральную Беларускую Школьную Раду;

3. Паведамляючы аб вышэй сказаным, Ц.Б.Ш.Р. даводзіць да ведама заінтарасаваных, што ею робяцца перад уладаю заходы аб адчыненьні беларускіх вучыцельскіх курсаў у Вільні на 300 слухачоў.

Цэнтрал. Беларус. Школ. Рада.
Вільня, Віленская 12--6.

Карэспандэнцыі.

Пародыя самаўрадаваньня.

(*С л о н і м*).

Пародыяй самаўрадаваньня зьяўляюцца ў нас павятовыя соймікі. Слонімскі соймік ня робіць вынятку. Старшынёю сойміку зьяўляецца павятовы стараста, а сябрамі, пераважна, залежныя ад яго войты. Атрымліваючы пэнсію ня менш, як настаўнікі, седзючы на гаспадарках і маючы пабочныя даходы „па службе“, гэтыя паны багацеюць ня днямі, а гадзінамі. Калі пры разглядзе якога пытаньня стараста запытаецца: „хто проціў?“, то ўсе маўчаць. Калі-ж які „нетактоўны“ войт выступіць з апазіцыяй, то стараста зараз асадзіць пытаньнямі „ну, што там скажа п. войт?“ І той, зразумеўшы, што ён мае дачыненьне з сваім начальнікам, адразу сьціхае.

„Дэмакратычны“ Слонімскі соймік купіў цялятамі 6 чырвоных бычкоў, каб з іх выгадаваць племенных быкоў... Аднак, кармілі іх так дрэнна, што быкі вышлі заморкамі, і іх соймік выставіў на таргі. Гэтых бычкоў з таргоў, змовіўшыся наперад з гандлярамі, купіў радны сойміку п. Калантай і купіў за бязцэн, бо ў сярэднім цана бычка была 100 зл., а ён купіў іх шмат танней—па 65 зл. за штуку. Соймік нічога ня меў проці таго, каб чырвоныя бычкі дасталіся Калантаю.

Цяпер будуць нанова гавадзіць чырвоных бычкоў, бо мужыкі ў нас нячырвоныя. **Б.**

Прыезд дэпутата.

(*Вёска Чамяры, Слонімскага павету*).

12.I.1925 году, у дзень поснай Куцьці перад Трыма Каралямі, вёска Чамяры мела падвойнае сьвята. Вольны, з прычыны Куцьці, ад працы народ спаткаў свайго дэпутата ў Сойм, грамадзяніна Рагулю, які неспадзявана прыехаў у Чамяры, каб на мейсцы пазнаёміцца з варункамі, у якіх жыве адзіная на гміну прыватная пачатковая беларуская школа. Вестка аб гэтым маланкай абляцела ўсю вёску. Старыя і маладыя, прыбраўшыся пасьвяточнаму, пачалі зьбягацца, каб паглядзець на выбранага імі дарагога пасла. У кароткі час каля школы сабралася з чатырыста асоб, ня лічучы вучняў. Вуліцу і двор прыбралі пасьвяточнаму.

Сьвята было вялікае. Жывучы каля сарака гадоў на сьвеце, я ніколі ня бачыў такога прыкладнага парадку, ці такой радасьці, якая была відаць у прысутных пры спатканьні пасла Рагулі грамадзян. Старыя па гадоў 65—70 цягнуліся адзін перад адным, каб хоць пабачыць свайго заступніка. Жонкі, бягучы ў грамаду, плакалі ад радасьці, называючы пасла сонейкам, якое заглянула ў іх гаротную хату.

У гэтае вялікае сьвята, якое здарылася адзін раз у пяць гадоў, жанчын дома не маглі затрымаць нават іх маленькія грудныя дзеці.

А гадзіне 10 зрана пасол прыбыў у школу. Каля школы яго спаткаў вучань, І. Міска, з хлебам і сольлю і з кароткім прывітаньнем. Пасол падзякаваў за прывітаньне і ад сябе і ад усяго Пасольскага Клюбу, ды пачаў вітаць вучняў і ўсю грамаду, што зьбеглася на яго спатканьне. Пасьля прывітаньня зайшлі ў школу. Школа—вельмі цесная (7 . 8 . 3½ арш.), але зьмясьціла ўсіх 57 вучняў і шмат гасьцей. Тут пасла вітаў вучыцель школы, Бурсэвіч. Пасьля прывітаньня вучнёўскі хор пяяў.

Пасол пабыў у школе каля поўгадзіны. За гэты час вучні паасобку і ў групах прадэклямавалі некалькі вершаў, апавяданьняў і жартаў. Было відаць, што пасол перажывае ў сэрцы сваім радасныя, а заразам і цяжкія мінуты. Прад ім, з аднаго боку, стаяў народ, які праз родную школу імкнецца да лепшай долі і сьвятлейшай будучыні, з другога — школьная адміністрацыя, якая не згаджаецца легалізаваць гэтую школу і пусьціць яе ў школьны будынак, што стаіць зусім пусты, ды ў якім жыве бяз працы польскі вучыцель. Затое, што дзеці ня ходзяць у польскую школу і нібы зусім ня вучацца, вёска аштрафавана больш, як на 3,000 злотых. Вялікі і цяжкі сум агарнуў сэрца пасла. Гэтыя думкі і гэтыя цяжкія мінуты мелі і прысутныя жанчыны і мужчыны ў сэрцах сваіх.

Ад імя Пасольскага Клюбу пасол ахвяраваў на патрэбы 25 злот. і дзякаваў вучням за іх стараньне і за іх імкненьне да навукі, зазначаючы, што з усяе сілы будзе дабівацца легалізацыі школы і будзе яе падтрымліваць. Бацьком і маткам вучняў пасол расказаў аб тым, што ён быў у Слонімскага старасты і ў Школьнага Інспэктара. Інспэктар нібы даў слова — адмяніць кары. Бацькі і маткі былі рады, што пасол прасіў за іх п. Інспэктара, але ж... словам п. Інспэктара пакуль што ня вераць!

Разьвітаўшыся з прысутнымі, пасол пакінуў вёску.

Сьвята скончылася, але-ж памятка застанецца надоўга. Відаць, што народ, які аддаў свае галасы пры выбарах у Сойм за беларускіх паслоў, гатоў у кожны час аддаць за іх і жыцьцё сваё.

Чамеравец.

Вясковы тэатр.

(*З Косаўшчыны*).

У нашай вёсцы 11 студня 1925 г. хатнім спосабам адбылася вечарына, на якой вясковыя хлопцы згулялі твор „Пільнуй Сваей Хаты“.

Як жаноцкія, так і мужчынскія ролі ігралі пераважна хлопцы. Пасьля спэктаклю дэклямаваліся вершы Янкі Купалы. Прысутных было ў хаце паўнюсенька.

Вечарынаю гасьці засталіся здаволены. Яна прынесла ў іх сялянскае шэрае жыцьцё шмат сьвежых хварб і новае сьвятло.

З сумам трэба адзначыць, што вечарына гэта адбылася нялегальна, бо ніхто з запужаных сялян не адважыўся падаць п. Старасце просьбы аб дазволе. **„Нялегальны“.**

Прапажа газэтаў.

(*Івацэвічы*, Косаўскага п.).

З таго часу, як агентам, які выдае пісьмы і іншую карэспадэнцыю з тутэйшага паштовага аддзелу, стаўся нейкі п. Кідаўскі, беларускія газэты пачалі дахадзіць да нас надта неакуратна (гублюцца кудысь нумары). На нашы просьбы пашукаць такога і такога нумару, ад яго мы адтрымоўваем заўседы адзін і той самы адказ: „Niema czasu“.

Гэта дае магчымасьць думаць, што ў прапажы нашай газэты вінават сам пан Кідаўскі. Канфіскуючы сыстэматычна беларускую газэту, п. Кідаўскі, відаць, ня хоча падумаць аб тым, як дорага яна кожнаму з нас селяніну. А, можа, ён у гэтым мае якуюсь „вышэйшую“ „шляхотную“ мэту, дзеля каторай так цынічна і вульгарна абходзіцца з намі? **Птушка.**

Юрыдычныя парады.

1) **П. Кудліцкаму.** У справе заплаты за згарэўшы дом зьвярніцеся па гэткаму адрасу: *Dyrekcja Ubezpieczeń Wzajemnych, Wilno.*

2) **Беларусу Ѳ. Д-аву.** Трэба ведаць першы кантракт, а так нічога сказаць немагчыма.

3) **Язэпу Шырко.** Кожны ўзьбярэжны гаспадар мае права лавіць рыбу ў тэй часьці возера, якая прылягае да яго берагу, і ад гэтага берагу да палавіны возера. На ўсё возера ў такіх граніцах, як на рысунку, трэба было-б мець дакумант. Лепей пачынаць суд ня вам, але памешчыкам; тады яны павінны будуць паказаць дакумэнты, калі маюць.

4) **П—у.** Вы павінны даказаць, што брат ваш запраўды памер у Расеі.

Можна папрабаваць дастаць мэтрыку сьмерці брата цераз Польскага Консула; калі ёсьць хто знаёмы ў Расеі, то прасіць яго, каб дастаў мэтрыку, засьведчыў яе ў Польскага Консула і выслаў сюды заказным (з Расеі заказныя пісьмы сюды ходзяць); бяз мэтрыкі-ж нічога ня будзе.

Усячына.

400-лецьце сьмерці Васко дэ Гамы.

24 студня ў сталіцы Партугаліі сьвяткуюць 400-лецьце сьмерці вялікага партугальскага мараходца Васко дэ Гамы, які адкрыў маркі шлях у Індыю.

У сьвяткаваньні прымаюць учасьце ўсе дзяржавы праз сваіх спэцыяльных прадстаўнікоў.

Рэдактар-Выдавец **Антон Пракапеня.**

Друкарня **Н. Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая 22.